УДК 378:808.26

В. М. Гусева, выкладчык

# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ І ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ

The main goals of student's national and international education are exposed in the article, the ways and methods of its realization on the Belarusian language classes.

Важнай часткай навучальнага працэсу ў вну з'яўляецца выхаванне такіх грамадскіх каштоўнасцей, як нацыянальная самасвядомасць, патрыятызм, павага да іншых народаў, іх культуры і традыцый.

Нацыянальная самасвядомасць уключае ў сябе нацыянальную годнасць, гонар за мінулае сваёй Радзімы, павагу да традыцый, духоўнай спадчыны свайго народа. Першаснае значэнне ў нацыянальным выхаванні павінна надавацца мове, бо мова – гэта той грунт, на якім узраслі фальклор і нацыянальная літаратура, гэта аснова духоўнай культуры народа, найважнейшы элемент рэлігіі, філасофіі, мастацтва.

Разам з тым важна падкрэсліць, што нацыянальнае выхаванне павінна ажыццяўляцца ў непарыўнай сувязі з выхаваннем інтэрнацыянальным. Фарміраванне талерантных адносін да прадстаўнікоў іншых нацый, павагі да іх культуры і ладу жыцця вельмі актуальныя на сучасным этапе развіцця нашага грамадства. Рэспубліка Беларусь – поліэтнічная дзяржава, і неабходнай умовай стабільнага і паспяховага яе развіцця з'яўляюцца паважлівыя адносіны да прадстаўнікоў усіх нацыянальных супольнасцей. Любоў да Радзімы, гонар за сваю прыналежнасць да беларускай нацыі павінны спалучацца з глыбокай павагай да іншых народаў. Фарміраванне культуры міжнацыянальных адносін – важная задача выхавання студэнцкай моладзі. Вывучэнне стасункаў беларусаў з іншымі народамі ад старажытнасці да нашых дзён, гісторыі, звычаяў і культуры розных этнічных меншасцей на нашай зямлі, іх рэлігіі, ментальнасці, псіхалогіі і інш., прасочванне глыбокіх гістарычных каранёў талерантнасці беларусаў маюць вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

Важным з'яўляецца і той аспект, што Рэспубліка Беларусь – гэта незалежная еўрапейская краіна, якая падтрымлівае шырокія кантакты з дзяржавамі блізкага і далёкага замежжа. Беларусь імкнецца быць «роўнай сярод роўных» у свеце, і ў гэтых умовах патрыятычнае, нацыянальнае і інтэрнацыянальнае выхаванне набываюць асаблівую актуальнасць.

На занятках беларускай мовы вядзецца пастаянная і мэтанакіраваная праца ў азначаным накірунку. Студэнты праяўляюць вялікую цікавасць да вывучэння мовы, гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры, мастацтва свайго народа. Дастаткова адзначыць, што вынікам гэтага з'яўляюцца падрыхтаваныя студэнтамі творчыя працы пад агульнай назвай «Мая малая радзіма»: «Случчына», «Мой край», «Бабруйск учора і сёння», «Мая Браслаўшчына», «Помнікі архітэктуры Беларусі», «Нясвіж», «Запаведнікі Беларусі» і інш.

Праводзяцца навуковыя даследаванні паходжання назваў беларускіх гарадоў, вёсак і рэк: «Тапонімы Ганцавіцкага раёна», «Тапонімы Пухаўшчыны», «Гідронімы Браслаўшчыны», «З гісторыі паходжання тапонімаў Крупскага раёна», «Тапонімы геаграфічных аб'ектаў сейлавіцкай зямлі» і інш.

Выхаванне любові да малой радзімы – гэта важны крок на шляху фарміравання сапраўднага патрыятызму, пачуцця глыбокай павагі і адданасці Айчыне, адказнасці за яе лёс.

Бясспрэчным з'яўляецца тое, што фарміраванне нацыянальнай годнасці і павагі да мінулага Радзімы немагчыма без ведання духоўнай спадчыны народа. Вялікае значэнне тут належыць вывучэнню вуснай народнай творчасці. У фальклоры, як ні ў чым іншым, выяўляецца душа народа, адлюстроўваюцца такія рысы беларускага характару, як мужнасць, працавітасць, моцная прывязанасць да сваёй зямлі, сціпласць, ветлівасць, гасціннасць. Пачуццём глыбокай любові да Радзімы прасякнуты беларускія прыказкі і прымаўкі, шматлікія паданні, казкі і песні. Народныя святы і абрады – гэта той скарб, які перадаваўся праз пакаленні на працягу многіх стагоддзяў і які вельмі важна не страціць сёння. Пры вывучэнні беларускай мовы фальклору надаецца вялікая ўвага. Цікавасць выклікаюць студэнцкія працы, прысвечаныя збіранню і сістэматызацыі звычаяў, абрадаў, святаў; даследаванні фальклору сваёй мясцовасці: «Асаблівасці традыцыйнай вясельнай абраднасці беларусаў на Гродзеншчыне», «Танцавальны фальклор жыхароў вёскі Таль», «Каляндарна-абрадавыя песні Карэліччыны», «Мастацка-вобразны свет песень Чэрвеньшчыны» і інш.

Важна падкрэсліць, што наша дзяржава добра разумее важнасць такіх даследаванняў менавіта сёння, калі на першым месцы стаіць задача захавання незалежнасці Беларусі. Актуальнасць і запатрабаванасць такіх прац даказваецца тым, што на рэспубліканскім конкурсе навуковых студэнцкіх работ (2006 г.) дзесяць работ, падрыхтаваных пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры беларускай мовы, атрымалі высокую ацэнку (I, II і III катэгорыі). Нам уяўляецца бясспрэчным, што вывучэнне гісто-

рыі і культуры свайго народа спрыяе станаўленню сапраўднага грамадзяніна і патрыёта.

Важнае месца ў нацыянальным выхаванні належыць пазааўдыторнай працы. Экскурсіі па славутых мясцінах Беларусі (Гродна, Жыровічы, Заслаўе і шматлікія іншыя) дазваляюць студэнтам лепш пазнаць свой край, убачыць на свае вочы знакамітыя помнікі архітэктуры, месцы, звязаныя з гістарычнымі падзеямі, даведацца пра малазнаёмыя старонкі гісторыі. Пазнаёміцца з мастацтвам Беларусі студэнты могуць пры наведванні Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, выстаў у Палацы мастацтваў; такія наведванні даўно сталі традыцыйнай формай працы на кафедры беларускай мовы.

Разам з тым вялікая ўвага на занятках беларускай мовы аддаецца вывучэнню гісторыі і традыцый іншых народаў, у прыватнасці рускіх, палякаў, украінцаў, яўрэяў, цыганоў і інш. Іх лёс, ментальнасць, лад жыцця выклікаюць жывую цікавасць моладзі, што, безумоўна, спрыяе выхаванню неабыякавых і паважлівых адносін да іншых народаў. У якасці прыкладу можна назваць такія тэмы даследаванняў студэнтаў, як «Лёс яўрэяў на Беларусі», «Беларускія татары: ад часоў Вітаўта да нашых дзён», «Стараверы на беларускай зямлі» і інш. Вывучаецца як гістарычны лёс іншых народаў і іх стасункі з беларусамі на працягу стагоддзяў, так і этнасацыяльная і этнаканфесійная сітуацыі на сучасным этапе развіцця нашага грамадства. Важна паказаць студэнтам, што талерантнасць беларусаў мае глыбокія гістарычныя карані, што беларусы спрадвек ставіліся з павагай да людзей іншай веры і культуры, што на нашай зямлі жылі побач розныя этнічныя групы, якія маглі свабодна адпраўляць абрады, будаваць свае храмы, размаўляць на сваёй мове. Сённяшняя палітыка дзяржавы працягвае гэтыя традыцыі і ўлічвае інтарэсы ўсіх этнічных груп.

Праз авалоданне скарбам нацыянальнай культуры і вывучэнне культуры іншых народаў ляжыць шлях да культуры сусветнай. Фарміраванне ў студэнтаў разумення гэтага – важная задача педагогаў, якая павінна ажыццяўляцца ў працэсе навучання.

**Літаратура**

1. Концептуальные основы идейно-воспитательной работы с детьми, учащейся и студенческой молодежью. – Минск, 2003. – 15 с.

2. Канцэпцыя адукацыі і выхавання ў Беларусі // Адукацыя і выхаванне. – 1993. – № 12. – С. 3–9.

3. Кузьміч, В. А. Развіццё і рэалізацыя ідэй канцэпцыі і праграмы выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі (з вопыту выхаваўчай працы кафедры беларускай мовы): метад. дапаможнік / В. А. Кузьміч. – Мінск: БДТУ, 2004. – 112 с.